# САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫ ПРАЕКТ “НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ВАЧЫМА МОЛАДЗІ XXI СТАГОДДЗЯ”



**Сусед-Вілічынская Юліяна Самсонаўна,**
*дацэнт кафедры музыкі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат педагагічных навук; заснавальнік узорнага фальклорнага калектыву “Зорачкі” ДУА “Гімназія № 1 г. Віцебска”*

**МЫ ЛЮБІМ РАДЗІМУ НЕ ТАМУ, ШТО ЯНА ВЯЛІКАЯ, А ТАМУ, ШТО ЯНА СВАЯ**

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці фарміравання сацыяльна актыўнай асобы праз беларускі фальклор у рамках сацыяльна-педагагічнага праекта “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя”. Адзначаны праект распрацаваны для сумеснай дзейнасці ўзорнага фальклорнага калектыву “Зорачкі” ДУА “Гімназія № 1 г. Віцебска” і фальклорнага калектыву “Вясёлка” педагагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава.*

**Уводзіны.** Асноўнымі напрамкамі дзяржаўнай моладзевай палітыкі Рэспублікі Беларусь з’яўляюцца: грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне моладзі, садзейнічанне фарміраванню здаровага ладу жыцця моладзі; дзяржаўная падтрымка маладых сямей, садзейнічанне рэалізацыі права моладзі на працу; дзяржаўная падтрымка моладзі ў атрыманні адукацыі; дзяржаўная падтрымка таленавітай і адоранай моладзі; садзейнічанне рэалізацыі права моладзі на аб’яднанне; садзейнічанне развіццю і рэалізацыі моладзевых грамадска значных ініцыятыў; міжнароднае моладзевае супрацоўніцтва [1]. Дадзены Закон накіраваны на вызначэнне мэт, прынцыпаў і асноўных напрамкаў дзяржаўнай моладзевай палітыкі як важнага элемента дзяржаўнай палітыкі ў галіне сацыяльнага, эканамічнага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўная моладзевая палітыка можа ажыццяўляцца і па іншых напрамках. Гэта дазваляе актуалізаваць здольнасць моладзі самастойна рабіць выбар у палітычнай, эканамічнай, прафесійнай, бытавой і іншых сітуацыях. Выхаванне маладога пакалення павінна ўключаць дзейнасць па фарміраванні ў яго ўменняў распараджацца свабодай, г.зн. самастойна ставіць асабістыя і сацыяльна значныя мэты, праектаваць траекторыю іх дасягнення ва ўсёй сацыяльнай прасторы, прагназаваць магчымыя вынікі, планаваць час, самастойна знаходзіць неабходную інфармацыю і г.д. [2].

Маральнае выхаванне школьнікаў прадугледжвае развіццё духоўна-маральнай сферы, выхаванне дзіцяці думаючым, дабрадзейным, міласэрным, тым, хто верыць у магчымасць удасканалення свету і людзей, сумленным, працавітым, сціплым, паважлівым, адказным. Выхаванне духоўнай асобы магчыма толькі сумеснымі намаганнямі сям’і, адукацыйнай установы і дзяржавы.

Вызначаючы маральнае выхаванне як мэтанакіраваны працэс далучэння дзяцей да маральных каштоўнасцей чалавецтва і канкрэтнага грамадства, варта звярнуць увагу на традыцыі маральнага выхавання дзяцей як абавязковага шанавання старэйшых. Этнограф П.В. Шэйн, апісваючы побыт беларускага народа ў дарэвалюцыйны час, адзначыў: «Да старэйшых гадамі, як да суседзяў, сяляне нашы як раней, так і цяпер заўсёды ставіліся і ставяцца з павагаю» [цыт. па: 3, с. 49]. Павага да бацькоў, старэйшых па ўзросце, да ўсіх людзей выхоўвалася на працягу многіх стагоддзяў праз асабісты прыклад, апявалася ў песнях, апавядалася ў казках. Паважлівае

Репозиторий ВГУ

стаўленне да людзей з'яўлялася і закладам ўласнага дабрабыту, бо служыла ажыццяўленню пераемнасці сувязі пакаленняў.

Безумоўна, выкананне беларускіх народных песень і танцаў, выкарыстанне ў педагагічнай дзейнасці розных жанраў вуснай народнай творчасці спрыяюць ўмацаванню маральных асноў асобы дзіцяці.

Пытанні арганізацыі змястоўнага вольнага часу моладзі, напоўненага грамадска карыснай дзейнасцю, якая прадугледжвае дапамогу ветэранам і пажылым людзям, гісторыка-пошукавую і краязнаўчую дзейнасць, шэфскую і валанцёрскую дапамогу, адзначаныя ў працах Г.М. Бяспалавай, А.Я. Бачарава, В.Ю. Коласавай, У.І. Курбатава, В.В. Курбатавай, Т.Г. Новікавай, І.В. Рудэнка, Н.Р. Цімаковай, А.Ф. Ушанава, Л.А. Яшчанкі і інш. Атрыманыя вынікі спрыяюць аптымізацыі дзейнасці па рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнскай моладзі, развіццю цікавасці да арганізацыі свайго вольнага часу і дапамагаюць згуртаванню калектыву.

Рэалізацыя дадзеных тэарэтычных палажэнняў магчыма ў рамках дзейнасці калектываў мастацкай самадзейнасці. У прыватнасці ўзорны фальклорны калектыў "Зорачкі" ДУА "Гімназія № 1 г. Віцебска" і фальклорны калектыў "Вясёлка" педагагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава ажыццяўляюць рэалізацыю сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя". Мэтай гэтага праекта з'яўляецца фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору. У кантэксце абранай мэты сфармуляваны наступныя задачы (у рамках дзейнасці ўзорнага фальклорнага калектыву "Зорачкі" ДУА "Гімназія № 1 г. Віцебска"):

- усведамленне малодшымі школьнікамі сутнасці грамадскасці і патрыятызму;
- выхоўванне павагі да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа;
- развіццё творчых якасцей (артыстызму, музычнасці).

Гіпотэзу сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя" можна сфармуляваць наступным чынам: калі выхаванне грамадскасці ажыццяўляць на аснове народных традыцый, то фарміраванне маральных каштоўнасцей і рэалізацыю творчага патэнцыялу малодшых школьнікаў мэтазгодна ажыццяўляць з выкарыстаннем традыцыйных тэатральных лялек.

**Структура сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя"**

Пад сацыяльна-педагагічным праектаваннем разумеецца магчымасць ператвараць сацыяльныя працэсы, з'явы, умовы з дапамогай педагагічных сродкаў. Кожны сацыяльна-педагагічны праект мае сваю грамадскую місію (прызначэнне). Ён нараджаецца на аснове сацыяльнага прагназавання і прадбачання, арыентаваны на змяненне навакольнага сацыяльнага асяроддзя (сацыяльных умоў) і патрабуе самавызначэння ўдзельнікаў праекта адносна якасці гэтага асяроддзя. Яго мэтай становіцца ініцыяванне з дапамогай педагагічна арганізаваных дзеянняў працэсу, здольнага прывесці да пазітыўных змен у сацыяльным асяроддзі. Спецыфічны кантэкст сацыяльна-педагагічнага праекта фарміруе адносіны сацыяльнага партнёрства. Пад сацыяльным партнёрствам у дадзеным выпадку разумеецца добраахвотнае і раўнапраўнае ўзаемадзеянне ў праектнай дзейнасці розных грамадскіх і дзяржаўных сіл, людзей рознага ўзросту і сацыяльнага статусу.

Педагагічны патэнцыял гэтага віду праектаў накіраваны на сацыялізацыю яго ўдзельнікаў, іх ўсвядомленую адаптацыю да існуючых умоў, на фарміраванне ўмення прадуктыўна ўзаемадзейнічаць з навакольнай сацыяльнай прасторай, паляпшаючы яе па магчымасці і тым самым вырашаючы свае праблемы. Па меры развіцця сацыяльна-педагагічнага праекта часта нараджаюцца новыя віды суб'ектаў і інавацыйныя формы сацыяльнай актыўнасці, што можа служыць паказчыкам дэмакратызацыі. Прэзентацыя ходу і вынікаў праектнай дзейнасці ў рамках праекта, які выходзіць за межы толькі адукацыйнай прасторы, можа насіць больш шырокі характар. Тут магчыма прыцягненне сродкаў масавай інфармацыі і розных відаў сацыяльных і камп'ютарных сувязей.

Сацыяльна-педагагічныя праекты здольныя аказваць пэўны пазітыўны ўплыў на наваколле, насычаючы прастору педагагічнымі элементамі і ўздзейнічаючы на грамадскую свядомасць [4].

Разгледзім асаблівасці сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя".

Перш за ўсё, варта адзначыць, што агульнапрынятае вызначэнне статусу моладзі – гэта адмысловая сацыяльна-ўзроставая група, якая адрозніваецца ўзроставымі рамкамі і сваім статусам у грамадстве: пераход ад дзяцінства і юнацтва да сацыяльнай адказнасці. Аднак канкрэтныя ўзроставыя рамкі, а таксама сацыяльны статус і сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці маюць сацыяльна-гістарычную прыроду і залежаць ад грамадскага ладу, культуры і ўласцівых дадзенаму грамадству заканамернасцей сацыялізацыі. Такім чынам, мы можам гаварыць пра студэнцкую моладзь і пра старшакласнікаў. Але прысутнасць у сацыяльна-педагагічным праекце вучняў пачатковай школы, якіх досыць складана аднесці да моладзевай узроставай катэгорыі, можа быць

Рэпазіторый ВДУ

апраўдана іх перспектыўным пераўвасабленнем. Акрамя таго, у народных традыцыях здаўна існавала сувязь пакаленняў у перадачы жыццёвага і прафесійнага вопыту.

Узаемадзеянне студэнтаў і выкладчыкаў педагагічнага і мастацка-графічнага факультэтаў ВДУ імя П.М. Машэрава і стварыла аснову для распрацоўкі і рэалізацыі сацыяльна-педагагічнага праекта “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя” (мал. 1).

Стварэнне батлеечных лялек (Дзед, Баба, Дамавік, дзяўчына Яніна, юнак Ясь, Цыган, Цыганка, Анёл, Д’ябал, Смерць і інш.) забрала досыць шмат часу і запатрабавала значнай падрыхтоўкі як тэарэтычнай, так і практычнай. Не прэтэндуючы на падрабязны аналіз працэсу вырабу лялек, варта адзначыць, што гісторыя развіцця беларускай батлейкі старанна вывучалася як студэнтамі педагагічнага, так і студэнтамі мастацка-графічнага факультэта. Не засталіся па-за ўвагай батлеечныя фэсты, сусветна вядомы лялечны тэатр С. Абразцова, беларускі тэатр “Лялька” ў г. Віцебску, Дзяржаўны тэатр лялек Рэспублікі Беларусь. Памеры лялек, іх выгляд, адзенне, асобы, прычоскі і іншыя немалаважныя дэталі абмяркоўваліся з незалежнымі экспертамі, у ролі якіх выступілі супрацоўнікі ДУ “Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”. А далейшая апрабацыя праектных ідэй ажыццяўлялася сярод слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі ДУДАД “Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі” і толькі пасля такой дбайнай падрыхтоўкі лялькі атрымалі права на існаванне: яны прымаюць актыўны ўдзел у розных канцэртных праграмах, ажываючы ў руках студэнтаў педагагічнага факультэта (фальклорны калектыў “Вясёлка”) і малодшых школьнікаў ДУА “Гімназія № 1 г. Віцебска” (узорны фальклорны калектыў “Зорачкі”).

Фальклорны спектакль як асноўная форма дзейнасці калектыву “Зорачкі” аб’ядноўвае песенны, тэатральны і агітацыйна-мастацкі накірункі. А пастановачны матэрыял – п’еса – створаны з улікам магчымасцей, здольнасцей і запатрабаванняў удзельнікаў калектыву, а таксама ўзроўню іх арганізаванасці. Працэс падрыхтоўкі спектакля фальклорнага калектыву прадстаўлены ў табл. 1.




Малюнак 1 – **Структура сацыяльна-педагагічнага праекта “Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя”.**



Репозиторий ВГУ

Табліца 1 – **Этапы падрыхтоўкі і правядзення спектакля**

| Этап | Сутнасць | Асаблівасці |
|---|---|---|
| Падрыхтоўчы | Стварэнне сцэнарыя тэатральнага або агітацыйна-мастацкага дзейства і партытуры музычнага суправаджэння. | Гэты творчы этап даволі працаёмкі ў сэнсе затрат часу, духоўных сіл, а ў асобных выпадках і матэрыяльных сродкаў. |
| Асноўны | Размеркаванне сцэнічных роляў і развучванне іх для дасягнення максімальнай выразнасці дэкламацыі і дзеяння. | Работа па засваенні зместу сцэнарыя і партытуры (ад першага і да апошняга знакаў – слоў і нот) праводзіцца непасрэдна на занятках фальклорнага калектыву і навучальнаму працэсу не перашкаджае. Вядома, гэта спрыяе выхаванню адказнасці. |
| | Фальклорны аркестр развучвае змест і паслядоўнасць музычнага суправаджэння выступленняў вакальна-танцавальнай групы. | |
| Заключны | Ажыццяўляецца аб'яднанне ў адзінае цэлае разрозненых элементаў спектакля, якімі паасобку авалодала кожная група. | Сцэнарных варыянтаў шмат, але кожны з іх абавязкова павінен несці ў сабе выразны духоўны і выхаваўчы пачатак, які можа праявіцца і ў сур'ёзнай, і ў жартаўлівай форме. |

Трэба ўлічваць прынцыпы асобаснай арыентацыі і гульнёвай дзейнасці падчас рэалізацыі пэўных сцэнарыяў (народныя абрады і святы, інсцэніроўкі казак і г.д.). Асобасная арыентацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу прадстаўлена дыялагічнасцю, дзейнасна-творчым характарам, накіраванасцю на падтрымку індывідуальнага развіцця дзіцяці, прадастаўленне яму неабходнай самастойнасці ў выбары зместу і спосабаў навучання і паводзін, а таксама ў прыняцці асабістых рашэнняў. Крытэрыямі асобаснай арыентацыі з'яўляюцца ўзровень агульнага развіцця і культуры вучня, а таксама валоданне ведамі ў пэўнай галіне; асаблівасці псіхічнага развіцця, характару і тэмпераменту асобы. Згаданыя параметры і крытэрыі выкарыстоўваюцца не толькі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, але і ў пазакласнай дзейнасці. Неабходна таксама звярнуць увагу на выкарыстанне суб'ектыўнага вопыту жыццядзейнасці дзіцяці, развіццё яго пазнавальных здольнасцей, магчымасцей самавызначэння і самарэалізацыі ў разнастайных умовах.

**Алгарытм фарміравання сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору.**

Работа творчага калектыву ацэньваецца па розных крытэрыях, якія ўлічваюць колькасць удзельнікаў, якасць выступленняў на разнастайных конкурсах, інтэнсіўнасць канцэртнай дзейнасці, ступень крэатыўнасці кіраўніка. Выкананне беларускіх народных песень і танцаў, зварот да вуснай народнай творчасці спрыяюць ўмацненню асноў патрыятызму, але выкарыстання толькі народнай спадчыны недастаткова для станаўлення Асобы грамадзяніна роднай краіны. Міжпрадметныя сувязі (літаратура і мова, філасофія і гісторыя), сямейнае выхаванне, асяроддзе, у якім выхоўваецца юная асоба, садзейнічаюць глыбокаму засваенню грамадзянскіх каштоўнасцей.

У верасні 2017 года дзіцячаму фальклорнаму калектыву "Зорачкі" споўнілася ўжо дваццаць восем год. Неабходнасць узмацнення выхавання падрастаючай змены, выкліканая патрэбамі духоўнага адраджэння, паспрыяла ўзнікненню фальклорнага калектыву. Заняткі ў "Зорачках" садзейнічаюць фарміраванню ў вучняў такіх якасцей, як любоў да Радзімы, да прыгажосці роднай зямлі, павага да айчыннай гісторыі, гонар за сваю нацыянальную культурную спадчыну. Гэта і складае сутнасць паняцця пра асобу чалавека-грамадзяніна. А ў дадатак – цікавасць да песеннай творчасці беларускага народа, яго традыцый і звычаяў.

Мэта работы фальклорнага калектыву "Зорачкі" – не забыць культуру продкаў-беларусаў, засвоіць песні і танцы бабуль і дзядуль і данесці свае веды і ўменні да кожнага чалавека.

Падчас стварэння фальклорнага калектыву былі вызначаны наступныя педагагічныя задачы:

• засваенне кожным удзельнікам калектыву сямейных мастацкіх каштоўнасцей;

• выхаванне моладзі не толькі на традыцыях усёй Беларусі, але і на традыцыях Віцебскага рэгіёна;

• выкарыстанне аўтэнтычнага фальклору Віцебшчыны.

Вырашэнне гэтых задач прадугледжвае стварэнне пэўных псіхолага-педагагічных умоў для засваення традыцый беларускага народа ў працэсе жыццядзейнасці сучасных гімназістаў.

Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне дзейнасці калектыву грунтуецца на прынцыпах гу-

Репозиторий ВГУ

маністычнай накіраванасці навучання і выхавання; сувязі з жыццём; навуковасці; фарміравання ў адзінстве ведаў і ўменняў, разумення і паводзін; навучання і выхавання ў калектыве; пераемнасці, паслядоўнасці і сістэматычнасці навучання і выхавання; эстэтызацыі навучання і выхавання [5, с. 3–4].

"Зорачкі" маюць яшчэ адну незвычайную асаблівасць. Яны, безумоўна, цікавяцца вынікамі свайго ўдзелу ў розных мерапрыемствах, конкурсах, аглядах мастацкай самадзейнасці. Але галоўнае для ўсіх удзельнікаў, як высветлілася на працягу многіх гадоў, – гэта сам калектыў; тое, чым юныя артысты займаюцца падчас уласных рэпетыцый і выступленняў; той эмацыянальны фон, які прысутнічае пры наведванні відовішчаў сяброўскіх калектываў; тая пазнавальная атмасфера, якая ўзнікае ў час экскурсійных падарожжаў па Беларусі.

Распрацаваны алгарытм фарміравання сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору ўяўляе сабой сістэму, якая ўключае наступныя этапы:

1. Уцягванне малодшых школьнікаў у рэпетыцыйны працэс, накіраваны на асэнсаванне, захаванне і інтэрпрэтацыю беларускіх народных традыцый.

2. Канцэртная дзейнасць ва ўстановах адукацыі і ва ўстановах сацыяльнай абароны насельніцтва ў рамках грамадзянска-патрыятычнага выхавання розных сацыяльных груп насельніцтва і папулярызацыі беларускіх народных традыцый.

3. Рэфлексіўнае асэнсаванне дзейнасці ў працэсе канцэртных выступленняў і непасрэдных кантактаў з гледачамі [6].

Напрамкі сацыяльна-педагагічнай дзейнасці ўзорнага фальклорнага калектыву "Зорачкі" прадстаўлены на мал. 2.

Былы ўдзельнік "Зорачак" і цяперашні лідар беларускага гурта "Rostany" Віктар Рудэнка даслаў відэавіншаванне да фальклорнага калектыву ў сувязі з яго дваццаціпяцігоддзем: "Я далучаюся да віншаванняў з найлепшымі пажаданнямі фальклорнаму калектыву «Зорачкі», які фарміраваў эстэтычны густ і разуменне культуры ў шматлікіх пакаленняў гімназістаў, такіх як я і мае сябры, якія зараз раскіданы па ўсім свеце і робяць вялікі ўнёсак у развіццё, магчыма, сусветнай культуры. Зараз згодна ўсё выражаць лічбамі. Таму дзве рэчы, якім я навучыўся, дзякуючы гімназіі і дзякуючы, у прыватнасці, калектыву «Зорачкі»: першае – гэта стыль, другое – гэта якасць. Менавіта гэтыя дзве рэчы вырашаюць і менавіта гэтыя дзве рэчы змяняюць навакольны свет. Няважна, чым вы займаецеся, ці вы распрацоўваеце новую мадель AppleiBook, ці вы пішаце песні. На міжнароднай арэне зараз працуюць касмапалітычныя законы. Але ж і амерыканцы, і шведы, і кітайцы ў сваіх кішэнях маюць свае нацыянальныя культуры і на гэтым падмурку будуюць сваю палітыку, эканоміку і мастацтва. А «Зорачкі» – гэта тое месца, дзе вы можаце пакласці ў сваю кішэню надзвычайны скарб народнай культуры, з якім вы будзеце ісці па ўсім свеце, змяняць сваё жыццё і жыццё іншых людзей. І памятайце, што ў кожным вялікім ёсць штосьці маленькае і інтымнае. І ў кожнай вялікай транснацыянальнай цывілізацыі б'ецца сэрца народная культуры".

Прывітальнае выступленне Вікторыі Кірпічэнка (педагог-арганізатар ДУА "Гімназія № 3 г. Віцебска імя А.С. Пушкіна", магістр філалагічных навук) дадало ў малюнак свята філасофскія думкі і яркія вобразы: "На холст кладуцца фарбы: мазок, штрых, яшчэ мазок. У выніку атрымліваецца карціна. Гэтак жа вымалёўваецца і карціна жыцця кожнага чалавека, толькі тут у якасці штрыхоў выступаюць людзі, падзеі, выпадкі, думкі (свае і не свае), выпадковыя словы, што могуць паўплываць на жыццё ці лёс. Але ж кажуць, што выпадковасці не выпадковыя.

З 10-ці гадоў я не толькі развучвала і спявала народныя песні і прымала ўдзел у розных мерапрыемствах. З дапамогай «Зорачак» я спасцігала тую багатую спадчыну, што засталася нам ад прадзедаў: традыцыі і звычаі беларусаў, песні нашых бабуль, трапную народную мудрасць у прыказках і прымаўках, усю шырыню душы беларуса і яго ментальнасць. Для чаго гэта? Чаму нельга проста адраджаць і спяваць народныя песні?

А адказ просты: каб размаўляць на мове народа, трэба адчуць і зразумець яго душу, а душа ў беларуса шырокая, шчырая. Каб спяваць зразумела і шчыра, трапіць у душу слухача, трэба ведаць не толькі мову, на якой спяваеш, але і культуру нашага народа, звычаі, традыцыі, асаблівасці нацыянальнага адзення, музычных інструментаў, побыту і нават перадумовы ўзнікнення народных песень. А перадумовы, зноў жа, у нашых звычаях, побыце, гісторыі і культуры.

Веданне, разуменне і адчуванне гэтага дазваляе не толькі спяваць, але і адчуваць сябе беларусам і ЧАЛАВЕКАМ наогул. Згадзіцеся, на станаўленні падлетка не можа не адбіцца ўдзел у традыцыйным святкаванні Масленіцы, Каляд, пастаноўка казак, адраджэнне аўтэнтычнага, СВАЙГО фальклору ў вёсках Пестуніца Віцебскага раёна і Вярэчча Гарадоцкага, выступленні ў дзіцячым доме і наладжванне святаў у дзяржаўных установах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва" [7].

Репозиторий ВГУ




Малюнак 2 – **Структура сацыяльна-педагагічнай дзейнасці ўзорнага фальклорнага калектыву “Зорачкі”.**



**Фальклорны калектыў “Вясёлка”.**



**Р. Шакулаў. Казка “Пяць пеўнікаў” у выкананні малодшай групы ўзорнага фальклорнага калектыву “Зорачкі”.**

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ



**Узорны фальклорны калектыў "Зорачкі".**



**Рудэнка В.**




**Кірпічэнка В.**

**Заключэнне.** Матывацыя ў студэнтаў педагагічнага факультэта і малодшых школьнікаў цікавасці да песеннага і танцавальнага беларускага фальклору, развіццё музычных здольнасцей (ладавае пачуццё, музычна-слыхавыя ўяўленні, музычна-рытмічнае пачуццё, музычная памяць), уменняў і навыкаў выканальніцтва ў народнай (аўтэнтычнай) манеры, набыццё вопыту творчай дзейнасці і публічных выступленняў спрыяюць фарміраванню сацыяльна актыўнай асобы сродкамі беларускага фальклору ў рамках сацыяльна-педагагічнага праекта "Народныя традыцыі вачыма моладзі XXI стагоддзя".

Такім чынам, мы можам адзначыць наступныя палажэнні, важныя, на наш погляд, для кіраўнікоў фальклорных калектываў:

• грамадска-патрыятычнае выхаванне вучняў мае розныя накірункі і прадугледжвае пэўныя вынікі пры ўмове сумеснай дзейнасці настаўнікаў і навучэнцаў;

• творчы працэс успрымання адпаведных народных традыцый і абрадаў заснаваны на індывідуальнай асобаснай арыентацыі і гульнёвай дзейнасці;

• сцэнічнае дзеянне прадугледжвае не толькі разнастайныя песенныя, танцавальныя і драма-

тычныя формы работы, але і непасрэдны кантакт з гледачом.

"Тры кіты" здзяйсняюць у рэчаіснасці гэтыя палажэнні: вучні; бацькі і сваякі вучняў; настаўнікі і адміністрацыя навучальнай установы. Толькі пры адзінстве мэтаў і ўзаемадзеяння дадзеных сацыяльных груп, у разуменні дзіцяці фарміруецца пазітыўнае ўспрыманне жыцця, адбываецца аднаўленне падзей, фактаў, аспектаў паводзін на ўзроўні генетычнай памяці, што не можа не прывесці да выхавання Асобы грамадзяніна і патрыёта сваёй Радзімы.

ЛІТАРАТУРА

1. Об основах государственной молодежной политики: Закон Республики Беларусь от 7 декабря 2009 г. № 65-З [Электронный ресурс] // Мир права. – Режим доступа: http://pravo.by/world_of_law/text.asp?RN=H10900065. – Дата доступа: 02.03.2015.
2. Моисеев, А.С. Психологический подход к определению понятия «социальная активность» [Электронный ресурс] / А.С. Моисеев. – Режим доступа: http://psyjournals.ru/files/63212/16_Moiseev.PDF. – Дата доступа: 10.03.2015.
3. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Нар. асвета, 1993. – 120 с.
4. Колесникова, И.А. Педагогическое проектирование: учеб. пособие для высш. учеб. заведений [Электронный ресурс] / И.А. Колесникова, М.П. Горчакова-Сибирская; под ред. И.А. Колесниковой. – М.: Изд. центр «Академия», 2005. – 288 с. – Режим доступа: http://pedlib.ru/Books/3/0212/3_0212-4.shtml#book_page_top. – Дата доступа: 12.12.2016.
5. Сусед-Вілічынская, Ю.С. "Радзімага краю мы песні спяваем. І долі, і шчасця ўсім Вам жадаем": з вопыту работы ўзорнага фальклорнага калектыву "Зорачкі" УА "Дзяржаўная гімназія № 1 г. Віцебска") / Ю.С. Сусед-Вілічынская. – Віцебск: УА "Дзяржаўная гімназія № 1 г. Віцебска", 2010. – 43 с.
6. Сусед-Виличинская, Ю.С. Воспитание младших школьников средствами этнопедагогики / Ю.С. Сусед-Виличинская // Поиск. Информационно-методический бюллетень ГУДОВ «ВО ИРО». – 2016. – № 4. – С. 28–32.
7. Сусед-Виличинская, Ю.С. Обобщение опыта формирования социально активной личности средствами белорусского фольклора (на примере образцового фольклорного коллектива «Зорачкі» ГУО «Гимназия № 1 г. Витебска») / Ю.С. Сусед-Виличинская // Поиск. Информационно-методический бюллетень ГУО «ВО ИРО». – 2015. – № 2. – С. 13–19.

Репозиторий ВГУ